истории? Кто задействован в событиях? Какие мотивы направляли участников событий? Какие факты были самыми важными? Какие из фактов, про которые вы хотели бы узнать, не отражены в событиях? Какие христианские заповеди были нарушены или соблюдены? Какие выводы можно извлечь из пословиц? Далее в группах участникам предлагается выполнить рисунок, схему или коллаж на тему пословицы и сделать его презентацию. В заключительной части проводится рефлексия: Что в данной пословице вас больше всего впечатлило? О каких христианских ценностях идет речь? Какие демографические процессы здесь имеют место? Что аккумулирует в себе эта пословица? Над чем вы задумались в ходе выполнения заданий?

Занятия с использованием эвристического анализа белорусских пословиц и поговорок проводились нами в 2015-2016 годах с более 200 учащимися старших классов учреждений общего среднего образования г. Минска и Минской области. Результаты наблюдений за работой учащихся на занятиях показывают, что они легко осваивают предложенную стратегию анализа пословиц, быстро осваивают приемы поиска смысла в поговорках и обнаруживают устойчивую связь между христианскими ценностями и сутью пословицы. Старшеклассники могут осуществить перенос обсуждаемой ситуации в жизнь общества, проанализировать соотношение между причиной и следствием событий. В итоговой рефлексии, учащиеся отметили работу с белорусскими пословицами и поговорками как ценную и интересную. А также выделяли как наиболее значимый момент то, что они самостоятельно «открыли» смысл конкретной пословицы, сделали личностно значимый вывод для своей будущей семейной жизни.

1. *Хуторской, А.В.* Дидактическая эвристика: Теория и технология креативного обучения. / А.В. Хуторской. – М.: Изд-во МГУ, 2003. – 416 с.

2. *Мартынова, Л.А.* Здравствуй, аист! Интерактивные методы при подготовке старшеклассников к семейной жизни. / Л.А. Мартынова, И.В. Ботяновская // Образование Минщины. – 2014. – № 6. – С. 49-56.

***Іваненка Мікалай Міхайлавіч***

*намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце Дзяржаўнай установы адукацыі «Вілейская гімназія № 2»*

## Народная педагогіка ў сучаснай выхаваўчай прасторы

Мэта любой выхаваўчай сістэмы – падрыхтоўка чалавека да жыцця як сем’яніна, працаўніка, творцы, грамадзяніна. Галоўная каштоўнасць простай народнай педагогікі ў яе непарыўнай і арганічнай сувязі з жыццём. Ніхто ў даўнейшыя часы асобна не вызначаў задачы выхавання – людзі проста жылі, і само жыццё выхоўвала іх [4, с. 21]. Але пры гэтым нашы продкі ставіліся да выхавання вельмі адказна, адчуваючы на ўсё свой час: «Да трох год дзіця як яечка, да сямі як авечка, а з сямі – навучай ды к працы прывучай!» [3, с. 117]. Беларусы заўсёды ўспрымалі дзяцей як дар Божы і вялікае шчасце: «Багаты Аўдзей: поўна хата дзяцей» [3, с. 114], «Дзе дзяцей лава, там бацькам слава»

[5]. Лічылася, што для стварэння належных умоў выхавання ў сям'і павінна быць не менш трох дзяцей: «Адно дзіця – не дзіця, двое – паўдзіцяці, а толькі трое – дзіця» [3, с. 114]. Людзі заўважалі, што аднаго выхоўваць цяжка: «Адзін сын да сівых валасоў дзіцятка», «Адзін – не людзін», «Ён у іх адзін – залізаны, пшанічны, сахарны, пышны, смятаннік...» [5].

Вельмі важна, якімі каштоўнасцямі жыве сям'я, што пакладзена ў аснову яе жыццядзейнасці і ўзаемаадносін, ці змогуць бацька і маці сваім асабістым прыкладам падараваць дзецям здольнасць быць шчаслівымі. Спакон веку нашы дзяды-прадзеды не перакладвалі адказнасці за выхаванне дзяцей ні на царкву, ні на школу... «Якое дрэва, такі і клін – які бацька, такі і сын» [2, с. 149], «Яблык ад яблыні далёка не коціцца» [1, с. 84], «Які род, такі і плод» [1, с. 84], «Гадавала сава дзеці, а няма на што глядзеці» [5], «З дурнога куста і ягада пуста» [2, с. 132]. Народ падкрэслена вылучае адказнасць бацькоў за выхаванне дзяцей: «Не дагледзіш вокам – вылезе бокам», «Чужы дурань – смех, а свой – сорам» [2, с. 147]. Каму хочацца, каб яго гора вучыла жыць? У падмурку сямейнага ладу, сістэмы выхавання і падрыхтоўкі моладзі да будучага сямейнага жыцця шэсць непахісных асноў:

- вера і глыбокая пашана да святыні;
- аўтарытэт бацькоў і падкрэсленая павага да дарослых;
- цнатлівасць як аснова здароўя сям'і, сапраўднага кахання і шчасця;
- працавітасць і працалюбства, адносіны да працы як да найвялікшай вартасці;
- дысцыпліна жыцця, у аснове якой размераная цыклічнасць дня, тыдня, года;
- радасць жыцця (працы і свята) з цудоўнай сямейнай і каляндарнай абраднасцю, сугучнай гадавому колу хрысціянскага календара.

Чалавек вольны выбіраць: «Ступіў за парог, а там сем дарог», «У чыстым полі чатыры волі» [5]. На базе Вілейскай гімназіі №2 дзесяць год дзейнічаў сацыяльна-педагагічны праект «Этнашкола». Намі назапашаны багаты вопыт выкарыстання народнай педагогікі і лепшых здабыткаў традыцыйнай культуры народа ў сучаснай выхаваўчай прасторы.

---

1. Арлова, Г.П. Народная педагогіка ў выхаваўчай рабоце школы / Г.П. Арлова. – Мінск: ГВЗАТ «Маладняк», 1995. – 160 с.

2. Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы / Склад. Ф.Я. Янкоўскі; Прадм. Д.Я.Бугаёва. – Мінск: Бел. навука, 2004. – 494 с.

3. Беларусы. Т.5. Сям'я / В.К. Бандарчык, Г.М. Курыловіч, Т.І. Кухаронак і інш.; Рэдкал.: В.К. Бандарчык і інш.; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. – Мінск: Бел. навука, 2001.– 375 с.

4. Кухаронак, В.Г. Выхаванне дасканалай асобы – асноўная мэта народнай педагогікі беларусаў / В.Г. Кухаронак, Т.І. Кухаронак// Традыцыйная культура і дзеці. Выпуск 1: Рэсп. эксперым. праект «Танцавальны фальклор і дзеці»/ Уклад. М.А. Козенка. ¬– Мінск: БелДІПК, 2004.– С. 20 – 24.

5. Матэрыялы этнаграфічных экспедыцый (запісы 1998 – 2015 гадоў) / Асабісты архіў М.М. Іваненкі. – Вілейка.